ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар установы адукацыі
«Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Еўфрасінні Полацкай»
_________ Ю.Я. Раманоўскі
«___» _______ 2026 года

**ВОДЗЫЎ**
апаніруючай арганізацыіі – установы адукацыі
«Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай» – на дысертацыю
Селях Аксаны Аляксандраўны
«Трансфармацыя паўсядзённага жыцця беларускіх сельскіх дзяўчат
у Заходнім Палессі ў 20–80-я гг. ХХ ст.»,
прадстаўленую на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук
па спецыяльнасці 07.00.07 – этнаграфія, этналогія і антрапалогія

**1. Адпаведнасць зместу дысертацыі заяўленай спецыяльнасці і галіне навукі.**

Змест дысертацыйнага даследавання А.А. Селях «Трансфармацыя паўсядзённага жыцця беларускіх сельскіх дзяўчат у Заходнім Палессі ў 20–80-я гг. ХХ ст.», адпавядае заяўленай спецыяльнасці 07.00.07 – этнаграфія, этналогія і антрапалогія і галіне – гістарычныя навукі.

Аб'ект, прадмет, мэта, задачы, метадалогія даследавання адпавядаюць пашпарту спецыяльнасці, згодна з якім этнаграфія, этналогія і антрапалогія – галіна навукі, якая займаецца вывучэннем этнасаў, у тым ліку іх спосабаў жыццядзейнасці, ладу жыцця, этнакультурных традыцый (Загад Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 30 красавіка 2025 г. № 104).

Змест дысертацыі адпавядае наступным галінам даследаванняў: п. 6 «Гісторыя духоўнай і сацыяльнай культуры (народныя веды, вераванні, звычаі і абрады, светапогляд і этнічная самасвядомасць, сацыяльныя арганізацыі)» , п. 7 «Арэальная этналогія (этнаграфія) і гістарычна-этнаграфічныя атласы. Этнакультурныя асаблівасці гістарычна-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі», п. 8 «Антрапалогія роднасці. Традыцыйныя і сучасныя формы сям'і і сямейных адносін» (Загад Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 30 красавіка 2025 г. № 104).

**2. Навуковы ўклад саіскальніка ў вырашэнне навуковай задачы з адзнакай яго значнасці.**

Дысертацыя А.А. Селях прысвечана наватарскай для беларускай этналогіі праблеме – трансфармацыі паўсядзённага жыцця беларускіх сельскіх дзяўчат у Заходнім Палессі ў 20–80-я гг. XX ст.

Актуальнасць тэмы дысертацыі абумоўлена тым, што ў сучаснай беларускай этналогіі вывучэнне дынамікі традыцыйнай культуры займае адно з цэнтральных месцаў. Комплекснае даследаванне пераўтваральных працэсаў у культуры беларускага этнасу ўяўляецца немагчымым без прадметнага разгляду змен у спосабах жыццядзейнасці, ладзе жыцця, традыцыях асобных этнічных, сацыяльных, статусных, полаўзроставых, канфесійных груп насельніцтва. Праблематызацыя штодзённасці дазволіла надаць гістарычнай карціне мінулага контуры "жывой" рэчаіснасці, пры даследаванні якой улічваліся індывідуальны вопыт чалавека, яго суб'ектыўныя ацэнкі і меркаванні, каштоўнасныя арыенціры. Вынікамі работы пацверджана, што паўсядзённасць – сфера чалавечага жыцця, якая ў большай ступені, чым іншыя забяспечвае стабільнасць і пераемнасць традыцыйных поглядаў і форм паводзін, таму выяўленне спецыфікі трасфармацыйных працэсаў у культуры на прыкладзе даследавання паўсядзённасці мае значную, у тым ліку, метадалагічную каштоўнасць для беларускай этналогіі.

Адметнасцю і каштоўнасцю даследавання А.А. Селях з'яўляецца яго рэгіянальны характар. Увага аўтара была сфакусавана на вывучэнні рэгіянальнай культуры заходнепалескай вясковай супольнасці, члены якой атаясамлівалі сябе з пэўнымі традыцыямі, імператывамі, глыбіннымі сэнсамі. Фіксацыя жывой аўтэнтычнай традыцыі садзейнічае захаванню культурнай спадчыны гістарычна-этнаграфічнага рэгіёна Заходняе Палессе. Арыгінальным і каштоўным робіць даследаванне выкарыстанне сабраных аўтарам у 2015–2023 гг. палявых этнаграфічных матэрыялаў.

Прадстаўленая работа ў значнай ступені пашырае межы навуковых ведаў пра культуру беларускага этнасу, яе рэгіянальныя асаблівасці. Матэрыялы і вынікі даследавання заўважна ўзбагацілі корпус назапашаных раней ведаў у галіне этналогіі, этнапедагогікі, этнапсіхалогіі, культурнай антрапалогіі і могуць быць карыснымі ў якасці крыніц для далейшых даследаванняў па этнаграфіі, этналогіі і антрапалогіі. У сувязі з гэтым дысертацыйная праца А.А. Селях бясспрэчна мае значную навуковую вартасць для беларускай навукі.

***Навуковая навізна дысертацыі А.А. Селях заключаецца ў:***

- абгрунтаванасці значнасці этналагічнага вывучэння полаўзроставай і статуснай катэгорыі "дзявоцтва" у сістэме сацыяльных (сямейных і грамадскіх) адносін;

- вызначэнні асноўных параметраў ("структур") штодзённага жыцця заходнепалескіх сельскіх дзяўчат;

- выяўленні і характарыстыцы ўзроставай і статуснай дзявочай стратыфікацыі, што існавала ў заходнепалескім сельскім соцыуме;

- разглядзе рэгіянальнай культурнай спецыфікі заходнепалескага вясковага соцыума на прыкладзе жыццядзейнасці асобнай полаўзроставай і статуснай группы – дзяўчат;

- выяўленні ступені захаванасці этнакультурных традыцый у заходнепалескай вёсцы на працягу 20–80-х гг. XX ст. праз даследаванне трансфармацыі дзявочай штодзённасці;

- разглядзе раней недаследаваных у беларускай этнаграфіі, этналогіі і антрапалогіі праблем: фарміраванне рукапіснай дзявочай культуры і ўвогуле дзявочай субкультуры, формы баўлення вольнага часу дзяўчатамі ў заходнепалескай вёсцы, уплыў родавых уяўленняў на становішча дзяўчыны ў сельскім соцыуме.

У рабоце А.А. Селях на належным узроўні абгрунтавана тэарэтычна-метадалагічная база даследавання. Дадзена разгорнутая характарыстыка падыходаў і метадаў, выкарыстанне якіх у комплексе забяспечыла глыбіню і змястоўнасць высноў.

Трансфармацыю штодзённага жыцця беларускіх сельскіх дзяўчат Заходняга Палесся А.А. Селях разгледзела ў сістэмным і функцыянальным адзінстве наступных кампанентаў: светапогляд, мясцовая гаворка, фальклор, матэрыяльная культура, сацыяльная культура, традыцыі баўлення часу, культура жыццезабеспячэння, свет пачуццяў і эмоцый, каштоўнасныя ўяўленні. Выкарыстанне сістэмна-функцыянальнага падыходу паспрыяла правядзенню якаснага даследавання з выяўленнем лагічных заканамернасцей і атрыманнем даказальных высноў.

Варта адзначыць, што дадатак дысертацыі складаюць візуальныя крыніцы, сабраныя асабіста аўтарам з прыватных архіваў рэспандэнтаў, што ўзмацняе навізну і арыгінальнасць даследавання. Выкарыстанне ў даследчым працэсе фотаздымкаў, матэрыялаў дзявочай рукапіснай культуры (анкет, спеўнікаў, альбомаў, дзённікаў пажаданняў, соннікаў) дазволіла больш аб'ёмна і рэльефна ўявіць дзявочае штодзённае жыццё і змены ў ім.

***Навуковая і практычная значнасць работы***

**Навуковая значнасць** работы А.А. Селях заключаецца ў тым, што матэрыялы даследавання запаўняюць існуючыя прабелы ў айчыннай гістарыяграфіі. Матэрыялы дысертацыі даюць уяўленне аб механізме функцыянавання заходнепалескай сялянскай культуры з пункту гледжання полаўзроставай і статуснай стратыфікацый, якія з'яўляліся адным са значных фактараў арганізацыі і дыферэнцыяцыі штодзённага жыцця грамадства.

Матэрыялы могуць быць запатрабаванымі і каштоўнымі не толькі для этнолагаў, а таксама для спецыялістаў іншых навуковых дысцыплін: культуролагаў, філолагаў, фалькларыстаў, гісторыкаў.

У прадстаўленай дысертацыйнай рабоце патлумачана значнасць і прадэманстраваны эўрыстычны патэнцыял этналагічнага вывучэння асобных полаўзроставых, статусных катэгорый насельніцтва пры даследаванні агульнаэтнічнай культуры, што акрэсліла перспектыву для далейшага навуковага пошуку.

Сабраныя аўтарам у сельскай мясцовасці Заходняга Палесся фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы былі перададзены ў Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (Ф. 23. Воп. 23. Спр. 1). Яны могуць быць выкарыстаны даследчыкамі пры далейшым вывучэнні актуальных праблем беларускай этнаграфіі, этналогіі і антрапалогіі.

**Практычная значнасць** дысертацыйнага даследавання заключаецца ў тым, што яго вынікі і матэрыялы могуць быць выкарыстаны пры далейшай распрацоўцы падручнікаў па этнаграфіі, этналогіі і антрапалогіі Беларусі, спецыяльных курсаў па адпаведнай тэматыцы для ВНУ. Распрацоўкі аўтара на сучасным этапе выкарыстоўваюцца ў навучальным працэсе на гістарычным факультэце УА "Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна" пры чытанні лекцыйных курсаў па дысцыплінах "Этналогія Беларусі", "Матэрыяльная культура і побыт Беларусі", "Гісторыя штодзённасці", "Культуралогія", "Сацыякультурная антрапалогія". Палявы інструментарый выкарыстоўваецца пры падрыхтоўцы і правядзенні вучэбнай гісторыка-краязнаўчай і археолага-этнаграфічнай практыкі студэнтаў I курса гістарычнага факультэта БрДУ. Распрацаваны дысертанткай апытальны ліст уключаны ў метадычныя рэкамендацыі да вучэбных практык. Матэрыялы даследавання ўкаранёны ў працу ДУ "Музей Беларускага Палесся". Супрацоўнікі музея выкарыстоўваюць распрацоўку падчас правядзення экскурсій і ў межах выязных лекцыйных заняткаў. Матэрыялы даследавання ўкаранёны ў адукацыйны працэс УА "Батчынская сярэдняя школа". Распрацоўка выкарыстоўваецца падчас рэалізацыі адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі краязнаўчай накіраванасці "Моя Кобринщина", а таксама ў працэсе падрыхтоўкі навукова-даследчых работ школьнікаў у галіне краязнаўства.

**Сацыяльная значнасць** работы заключаецца ў тым, што матэрыялы даследавання можна выкарыстоўваць для папулярызацыі нацыяльнальнай культуры, спрыяння ўсведамленню грамадствам значнасці і неабходнасці захавання культурнай памяці шляхам яе фіксацыі. Вывучэнне пазітыўнага сацыяльнага вопыту мінулага і яго трансляцыя сучаснаму пакаленню садзенічае фарміраванню этнакультурнай ідэнтычнасці.

**Выхаваўчы патэнцыял** работы заключаецца ў тым, што яе матэрыялы могуць быць выкарыстаны ў педагагічна-выхаваўчай дзейнасці – выхаванні маладога пакалення на мясцовых гістарычна-культурных традыцыях.

**Ступень дакладнасці** атрыманых вынікаў даследавання забяспечана пакладзенымі ў яго аснову метадалагічнымі прынцыпамі, комплексным выкарыстаннем метадалагічных падыходаў, адпаведных мэце і задачам даследавання, а таксама рэпрэзентатыўнасцю базы крыніц даследавання, якую склалі як апублікаваныя, так і ўпершыню ўведзеныя ў навуковы зварот неапублікаваныя архіўныя матэрыялы.

Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыйнага даследавання адлюстраваны ў 36 навуковых работах, з іх 8 – артыкулы, уключаныя ў пералік навуковых

выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў, 9 – артыкулы ў зборніках навуковых работ, 17 – артыкулы ў зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый, 2 – тэзісы. Аб'ём артыкулаў у выданнях, уключаных ў пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў, складае 5,8 аўтарскага аркуша. Агульны аб'ём публікацый – 12,5 аўтарскага аркуша.

**3. Канкрэтныя навуковыя вынікі, за якія саіскальніку можа быць прысуджана навуковая ступень.**

Дысертацыя А.А. Селях уяўляе сабой самастойную, кваліфікацыйную навуковую працу, якая мае лагічную структуру і завершанасць. Даследаванне адпавядае ўсім патрабавання ВАК Рэспублікі Беларусь, вызначаецца навізной і арыгінальнасцю.

Згодна з пп. 20, 21 "Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь" А.А. Селях можа быць прысуджана ступень кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.07 – этнаграфія, этналогія і антрапалогія за:

- абгрунтаванне значнасці этналагічнага вывучэння дзявочай штодзённасці, дынамікі яе змен;
- разгляд традыцый выхавання і сацыялізацыі беларускіх заходнепалескіх сельскіх дзяўчат у сям'і і соцыуме, аналіз дынамікі ў падыходах да выхавання;
- раскрыццё спецыфікі фарміравання асаблівасцей дзявочай субкультуры ў заходнепалескай вёсцы;
- выяўленне трансфармацыі традыцый дашлюбных паводзін беларускіх заходнепалескіх сельскіх дзяўчат;
- сістэмны разгляд традыцый баўлення часу беларускімі заходнепалескімі сельскімі дзяўчатамі;
- асэнсаванне ўплыву працоўных стратэгій сельскіх дзяўчат на змены ў дзявочай штодзённасці;
- выяўленне рэгіянальных асаблівасцей, фактараў і паказчыкаў сацыякультурнай трансфармацыі паўсядзёнага жыцця беларускіх сельскіх дзяўчат ў Заходнім Палессі ў 20–80-я гг. XX ст.

**4. Заўвагі па дысертацыі і аўтарэфераце.**

Трэба адзначыць, што прадстаўленая дысертацыя мае шэраг недахопаў.

1. У раздзеле "1.1 Аналітычны агляд літаратуры" аўтар адзначае, што "Храналогія гістарыяграфіі пытання ўключае ў сябе пяць перыядаў: другая палова XIX – пачатак XX ст., 1917–1930-я гг., другая палова 1940-х – 1960-я гг., 1970–1990-я гг., 2000–2020-я гг." (с. 11). Аднак не зразумела навошта аўтар вылучае і разглядае працы другой паловы XIX – пачатку XX ст. якія храналагічна не адносяцца да прадмета даследавання. Тым больш нават геаграфічна гэтыя працы прысвечаны іншым рэгёнам Беларусі. У гэтым раздзеле ўпамінаюцца даследчыкі (М. Анімеле, П.М. Шпілеўскі, А.Г. Кіркор, М.Я. Нікіфароўскі, М.В. Доўнар-Запольскі, А.Я. Багдановіч, Е.Р. Раманаў), якія нават не вывучалі Заходняе Паессе.

Таксама незразумелым выглядае аналітычны агляд прац 1920-1930-х гг., прысвечаных усходнебеларускім землям (у складзе БССР). Дысертант аналізуе працу А.Д. Горбача, якая прысвечана Бабруйскаму і Мазырскаму рэгіёну. Такая ж сітуацыя характэрна і для больш позніх перыядаў. Так, у гэтым раздзеле разглядаецца навуковая дзейнасць Г.І. Дулебы, якая не праводзіла этнаграфічныя даследаванні ў Заходнім Палессі.

2. Некаторыя пытанні выклікае выбарка рэспандэнтаў для правядзення палявых этнаграфічных даследаванняў. Як вынікае з тэкста работы, апытанне праводзілася не ва ўсіх канфесійных групах беларускага насельніцтва рэгіёна. Так, рэспандэнты-каталікі не былі апытаны аўтарам:. "Па рэлігійнай прыналежнасці 90 % інфарматараў праваслаўныя, 10 % – пратэстанткі" (с. 20). У той жа час у вывадах і нават палажэнні робяцца высновы аб уплыву канфесійнага фактара на паўсядзённую культуру сельскіх дзяўчат. Так, у палажэнні 3 аўтар адзначае наступнае: "Формы і змест баўлення часу ў значнай ступені вызначаліся сацыяльна-эканамічнымі і культурнымі працэсамі, што адбываліся ў вёсцы, а таксама канфесійнай прыналежнасцю дзяўчат".

3. Прадметам дысертацыі, як вынікае з яе тэксту, з'яўляецца "трансфармацыя паўсядзённага жыцця беларускіх сельскіх дзяўчат у Заходнім Палессі ў 20–80-я гг. ХХ ст.". Такім чынам, работа мусіць быць прысвечана дзяўчатам (паводле вызначэння аўтара: "статусная катэгорыя асобы жаночага полу, якая яшчэ не ўступіла ў шлюб і не мела дашлюбных палавых адносін", с. 28). Аднак амаль палова раздзела 2.2. "Традыцыі выхавання і сацыялізацыі сельскіх дзяўчат" (с. 42-46) прысвечана апісанню традыцый выхавання іншай узроставай катэгорыі – дзяцей (у большасці выпадкаў нават без уліку гендарнай прыналежнасці). Гэта выглядае некалькі нелагічна з пункту гледжання прадметнага поля даследавання.

4. Пэўныя пытанні выклікае фрагмент з высновамі аўтара да раздзела 2.3. Так, аўтар адзначае: "Такім чынам, аналіз матэрыялаў паказвае, што на працягу 1920–1980-х гг. мяняліся падыходы бацькоў і саміх дзяўчат да атрымання адукацыі. Гэта безумоўна прыводзіла да павелічэння пісьменнасці сярод дзяцей і падлеткаў, што давала магчымасць перагледзець жыццёвыя прыярытэты" (с. 58). Аднак у раздзеле 2.3. дысертацыі працэсы павелічэння долі пісьменных сярод дзяцей і падлеткаў не былі прааналізаваны.

5. У раздзеле 3.1. апісваюцца некаторыя рытуальныя практыкі дзяўчат (у пераважнай ступені, у структуры вясельнай абраднасці). Аднак узнікае заканамернае пытанне, наколькі феномен паўсядзённасці ахоплівае рытуальную сферу. Усё ж у сучаснай этналагічнай навуцы пануе падыход, згодна з якім рытуальная сфера і паўсядзённасць – розныя феномены. А таму рытуальная сфера не павінна была ўваходзіць у прадметнае поле дысертацыйнага даследавання.

**5. Заключэнне**

Дысертацыйнае даследаванне А.А. Селях з'яўляецца кваліфікацыйнай навуковай працай па спецыяльнасці 07.00.07 – этнаграфія, этналогія і

антрапалогія, выкананай у адпаведнасці з патрабаваннямі ВАК Рэспублікі Беларусь да кандыдацкіх дысертацый.

У адпаведнасці з загадам рэктара ўстановы адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай» (№ 256 ад 29.05.2026) водзыў і даклад саіскальніка заслуханы, абмеркаваны і зацверджаны на пасяджэнні навуковага сходу ўстановы адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай» 10 чэрвеня 2026 года (пратакол № 2 ад 10.06.2026 г.).

Саіскальнік навуковай ступені А.А. Селях выступіла на пасяджэнні навуковага сходу з дакладам па тэме дысертацыі і адказала на пытанні прысутных.

На пасяджэнні навуковага сходу прысутнічала 12 чалавек. З іх кандыдатаў навук – 12.

Водзыў прыняты адкрытым галасаваннем.

Вынікі галасавання па зацвярджэнні водзыва апаніруючай арганізацыі на дысертацыю А.А. Селях «Трансфармацыя паўсядзённага жыцця беларускіх сельскіх дзяўчат у Заходнім Палессі ў 20–80-я гг. XX ст.», прадстаўленую да абароны на атрыманне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.07 – этнаграфія, этналогія і антрапалогія: «за» – 12, «супраць» – няма, «устрымаліся» – няма.

Старшыня навуковага сходу:
загадчык кафедры гісторыі
і сацыягуманітарных навук,
кандыдат гістарычных навук А.М. Барун

Эксперт:
дацэнт кафедры гісторыі
і сацыягуманітарных навук,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт У.Я. Аўсейчык

Сакратар навуковага сходу:
дацэнт кафедры гісторыі
і сацыягуманітарных навук,
кандыдат гістарычных навук К.В. Андрэйчык

Подпись удостоверяю
Специалист по кадрам